БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 20 лістапада 1997 года, чацвер, № 15 (1770)

А ў вас? А ў нас!

Самы студэнцкі дзень

Пытацца аб знаходжанні прыпынку "Палац Моладзі" было неабавязкова — туды імкнуліся ўсе. Цёмныя вуліцы, што беглі за вокнамі не здолелі нікога падмануць, і студэнты шчасліва дабраліся да жаданага прыстанку...

Цяжка сказаць, што Дзень студэнта значыць для моладзі. Для кагосьці гэта падстава добра бавіць час, для кагосьці ўвогуле не свята. Але ўсё ж такі ўрачысты суботні вечар прымусіў хлопцаў і дзяўчат завітаць у Палац Моладзі, дзе той, хто не памятаў пра Дзень студэнта, — даведаўся, а хто не лічыў гэта за свята — адсвяткаваў.

Дыскатэка была арганізаваная грунтоўна. Выдатнае асвятленне, музыка на любы густ, культурная праграма (гумарыстычныя нумары, конкурсы на лепшы рэкламны верш, самыя доўгія ногі, малы памер абутку, высокія боты і г.д.). Ежы і напояў было дастаткова. Адным словам, арганізатары (БДУ і БПСМ) зрабілі ўсё, што ад іх залежала.

На пачатку вечара прысутныя даведаліся, што іхныя грошы пойдуць на новае абсталяванне для 33-й студэнцкай паліклінікі. Такая справа, канешне, выклікала ў большасці прысутных павагу да саміх сябе. Гэта (а можа і не толькі) абумовіла добры настрой.

Спяваў Дзмітрый Смольскі: лепш за ўсё прынялі яго "Троіцу". Некалькі разоў выходзіла Наталля Пятрэнка. Асабліва радасна адрэагавалі студэнты на "Забери меня с собой". Карацей кажучы, свята ішло поўным ходам.

Дыскатэка працягвалася з 8 гадзінаў вечара да 6 раніцы. У чатыры гадзіны некаторыя ўжо сядзелі вакол фантана ў фае і ціхенька драмалі. Але шмат да каго прыйшло другое дыханне, і гэтая частка працягвала танчыць да самага заканчэння. Публіка пераважна была культурная (адукацыя нагадвае пра сябе), таму і ноч прайшла ў прыемным сяброўскім асяроддзі.

...Пяць гадзінаў раніцы. Першы ў нядзелю трамвай ехаў па пустой вуліцы перапоўнены соннымі, але радаснымі студэнтамі. Некаторыя абмяркоўвалі вечарыну, хтосьці ціхенька пасопваў, былі і такія, што сачылі за дарогай...

Валерыя АЎСЯНІК

Прэс-апытанне

Качку з яблыкамі любяць не ўсе

Маленькае апытанне з нагоды Дня студэнта выявіла, чаму аддае перавагу сучасная моладзь. Падчас яго высветлілася, што ў 10% студэнтаў няма любімых лекцыяў, 80% не ведаюць увогуле, што гэта такое, а астатнія 10% падзяліліся падзяліліся паміж гісторыяй мастацтваў, інфраструктурай СМІ, архітэктурай і бухгалтарскім улікам.

Жыць разумным істотам, якіх называюць студэнтамі, найбольш падабаецца на Беларусі (49%). У адрозненне ад іх 30% любяць жыць дома (гэта не зашкодзіць час ад часу), 19% — у Мінску, 1% — на востраве Маўрыкій (самы дарагі востраў). Яшчэ 1% ставіцца да гэтага пытання абыякава.

Затое апытаныя амаль у адзін голас назвалі любімым святам Новы год (90%). З асаблівай асалодай уласны дзень нараджэння святкуюць 5% (у такім узросце гэта пакуль свята), а таксама — Купалле (5%).

85 са 100 студэнтаў ядуць усё, што трапіцца. У астатніх ёсць улюбёныя стравы: 5% гурманаў ядуць качку з яблыкамі, 5% ("новыя беларусы") — марожанае з МакДональдса, яшчэ 5% — арэшкі.

Любімым падручнікам студэнцтва 80% назвалі "Кнігу аб смачнай і здаровай ежы", 10% — "Крыміналістыку", а астатнія 10% яшчэ не вызначыліся.

На пытанне аб любімым месцы навучання апошнюю пазіцыю ў рэйтынгу заняў адказ "Дома, за пісьмовым сталом" (10%). Па 20% апытаных назвалі любімымі месцамі "Дома, на ложку" і "Дома, на кухні". Але безумоўным лідэрам (50%) быў разгорнуты адказ з масай падрабязнасцяў: "Дома, у крэсле, з кубачкам кавы, перад тэлевізарам, падручнік ляжыць на падлозе вокладкай дагары".

З выкладчыкамі студэнты амаль не сябруюць, і 97% пакуль не ведаюць, кто ж з іх найлепшы.

Апытанне правяла Валерыя АЎСЯНІК

Гасцёўня

Прыхільнік гумару і малочных кактэйляў

Не так ужо і часта завітвае да нас ва універсітэт такі адмысловы госць, як прэзідэнт Клуба вясёлых і знаходлівых Аляксандр Маслякоў. Да таго ж, ён і сам прызнаўся, што толькі, каб павіншаваць з дзесяцігоддзем каманду КВЗ БДУ, і зрушыў з месца, толькі з гэтае нагоды наведаў Мінск.

Ён усё такі ж абаяльны і падцягнуты, як адзінаццаць гадоў таму, калі КВЗ пасля доўгага перапынку распачаў другое тэлевізійнае жыццё. Хоць, як сам паведаміў журналістам, не імкнецца "тупа і ўпарта захоўваць гэтую падцягнутасць". Але часам не можа дазволіць сабе з'есці напярэдадні здымкаў столькі, колькі хацелася б. Ён паважае сваю прафесію і лічыць, што было б нядрэнна прытрымлівацца тых правілаў, якія яна дыктуе. Магчыма да заслугаў КВЗ можна далучыць і тое, што Маслякоў стаў прыхільнікам кактэйляў. Апошнім часам — пераважна малочных. Разуменне іх карыснасці прыйшло да Аляксандра Васільевіча з узростам.

Карэспандэнт "Беларускага універсітэта" за некалькі хвілінаў да пачатку юбілейнай гульні КВЗ Белдзяржуніверсітэта паспеў-такі задаць прэзідэнту Маслякову некалькі пытанняў.

— Вы заўсёды прыязджаеце ў госці да камандаў, якія святкуюць свой дзень нараджэння?

— Я прыязджаю на юбілеі да тых камандаў, да якіх стаўлюся з сімпатыяй і лічу іх добрымі. Гэта ў поўнай ступені мае дачыненне і да каманды КВЗ БДУ.

— Вас, дарэчы, часта называюць "хросным бацькам" гэтай каманды...

— Гэта мяне цешыць. Але не вельмі адпавядае рэчаіснасці. Проста ўпершыню яны паявіліся на тэлебачанні ў той перадачы, да якой я маю нейкае дачыненне. А кума ў мяне — рэчаіснасць, якая падштурхоўвае маладых людзей жартаваць з таго, што адбываецца ў іх жыцці.

- Як Вы знаходзіце каманды для ўдзелу ў гульнях?

— Кожны год у студзені ў Сочы прыязджаюць усе, хто жадае. У мінулым годзе было больш за сотню камандаў: вядомых і тых, аб назве гарадоў, з якіх яны прыязджаюць, мы даведваемся ўпершыню. Паверце, сто з нечым камандаў, кожная з якіх упэўненая, што менавіта яна выйдзе зараз на сцэну, а ўсім астатнім пасля таго там не будзе ўжо чаго рабіць,— гэта вельмі шмат. Нам даводзіцца знаёміцца з усімі. Часам я ўхіляюся ад гэтай некалькі пакутлівай працэдуры. Але ў мяне ёсць маладзейшыя калегі з больш устойлівай псіхікай. А потым мы адбіраем некалькі камандаў. І пачынаецца гульня.

— Раней перадача ішла ў прамым эфіры, а зараз чамусьці толькі ў запісе...

— У мінулым жыцці КВЗ ішоў сапраўды ў прамым эфіры. І мы змагаліся спачатку за тое, каб нам далі прамы эфір. Два паўфіналы і выходзілі "ўжывую". І што? Зараз столькі ўсяго навокал гаворыцца, што нікога нічым не здзівіш. Таму сёння я не прыхільнік прамога эфіру для КВЗ. Не таму, што нечага баюся. Проста хачу, каб гэта было дынамічнае тэлевізійнае дзейства. А гэта можна зрабіць, толькі падсабраўшы тую гульню, якая прайшла. Калі жартуюць смешна наконт самых высокіх персонаў, пры мантажы гэта абавязкова застанецца. Галоўнае, каб жарт быў трапным.

— Гледачы прыходзяць да вас за грошы ці па запрашальных білетах?

— Дастаткова складана і стратна ствараць гэтую перадачу. Але я прынцыпова лічу, што рабіць дарагімі білеты на гульню мы не можам. Бо асноўная частка гледачоў — маладыя людзі. Прадаваць за бясцэнак? Нам гэта нічога не дасць, акрамя лішняга клопату.

(Заканченне на 2-й стар.)

Выставы

Будынкі БДУ

Да 70-годдзя ўрачыстай закладкі універсітэцкага гарадка ва універсітэце наладжана выстава "Будынкі БДУ ў 20-30-я гады". Размешчана яна ў памяшканні бібліятэкі на 3-м паверсе галоўнага корпуса і будзе доўжыцца да пачатку снежня.

Дарэчы, на будаўніцтва універсітэцкага гарадка ў той час было аддадзена каля 6,4 мільёнаў рублёў. Каб уявіць памеры гэтай сумы, нагадаем, што стыпендыя студэнта ў той час складала каля 15 рублёў.

З будынкаў універсітэцкага гарадка з тых часоў захаваўся і корпус фізічнага факультэта, які цяпер аднаўляецца. А пабудаваны ён у 1925 годзе. Застаўся геаграфічны факультэт, а таксама частка будынка, дзе цяпер размяшчаецца НДІ ядзерных праблем. У перабудаваным выглядзе застаўся галоўны корпус. Зараз ён закрыты вежай педагагічнага універсітэта. Захаваўся таксама і будынак анатамічнага корпуса, які цяпер належыць медыцынскаму інстытуту.

Па словах загадчыка музея гісторыі БДУ Артура Гарыевіча Зельскага, на выставе экспануецца толькі частка унікальных фотаздымкаў з фондаў музея.

Таццяна КУХАРЧУК

***

На 4-м паверсе гістарычнага факультэта праходзіць яшчэ адна фотавыстава. Яна прысвячаецца 120-годдзю з дня нараджэння вядомых беларускіх гісторыкаў М.М.Нікольскага і У.М. Перцава.

***

На геаграфічным факультэце з 21 па 23 лістапада будзе праходзіць IX міжнародная мінералагічная выстава-кірмаш "Каменная казка".

Сакрэт фірмы

На ўвагу маладым навукоўцам

З мэтаю стварэння дадатковых стымулаў для эфектыўнай навуковай творчасці рыхтуецца "Палажэнне аб грантах для маладых вучоных Белдзяржуніверсітэта".

Савет маладых вучоных БДУ просіць усіх зацікаўленых уносіць прапановы да 20 снежня 1997 года на адрас: вул.Бабруйская, 7, пакой 417 ці па тэлефоне 268-70-98. Усе аўтары прапановаў будуць запрошаныя на пасяджэнне Савета маладых вучоных Белдзяржуніверсітэта, дзе будзе праводзіцца канчатковае абмеркаванне праекта.

Журфакаўская лятучка

20 лістапада на факультэце журналістыкі Белдзяржуніверсітэта прайшла Вялікая журналісцкая лятучка па выніках вытворчай практыкі студэнтаў.

Больш 400 студэнтаў адзінага ў Беларусі журфака ўдасканальвалі прафесійнае майстэрства ў рэдакцыях газет, радыё, тэлебачання, а таксама прэс-службах, інфармацыйных і рэкламных агенцтвах.

У Вялікай журналісцкай лятучцы журфака ўзялі ўдзел кіраўнікі сродкаў масавай інфармацыі, вядучыя журналісты газет, радыё і тэлебачання рэспублікі.

Хросная маці славутых вучняў

25 лістапада прафесар Ефрасіння Леанідаўна Бондарава святкуе свой юбілей. Ужо шмат гадоў яна працуе на факультэце журналістыкі. Сярод яе вучняў — журналісты, пісьменнікі, кінакрытыкі, рэжысёры... Напярэдадні свята Ефрасінню Леанідаўну павіншавалі шматлікія перыядычныя выданні. А мы вырашылі з гэтай нагоды даць слова яе вучням, якіх зараз ведаюць не толькі ў Беларусі, але і за мяжой.

Святлана АЛЕКСІЕВІЧ,
пісьменніца:

— Калі я думаю пра Ефрасінню Леанідаўну — майго навуковага кіраўніка падчас вучобы на факультэце журналістыкі, найперш успамінаецца яе сяброўскае стаўленне да студэнтаў. Аднойчы ў студэнцкія часы мы выпадкова сустрэліся з ёй у гастраноме. Што мы маглі купіць тады на сваю стыпендыю? І тут Ефрасіння Леанідаўна зусім па-сяброўску дала нам значную па тых часах суму...

Я заўсёды ўспамінаю яе з сімпатыяй. Яна ўпершыню дапамагла мне зразумець, што каштоўнасць чалавечых якасцяў — вышэй за тое, што нас часам раз ядноўвае. Мы так выхаваныя: нашыя перакананні, меркаванні, сцягі, пад якімі мы ходзім, нас адасабляюць,— і мы часта забываем, што мы проста людзі.

Алег СЛУКА,
намеснік міністра адукацыі, прафесар:

— Ёсць асабліва таленавітыя людзі, душа якіх — у сэрцы іх вучняў. Іх розум скіраваны на выгадоўванне талентаў маладога пакалення. Такі чалавек сам павінен быць надзвычай таленавіты, шчодры і высакародны. Вось такая і прафесар Бондарава.

Віктар ДАШУК,
народны артыст Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, кінарэжысёр:

— Сапраўды, людзей, якія паядналі ў сабе некалькі эпох, не так і шмат... Ефрасінню Леанідаўну я магу лічыць сваёй хроснай маці. У той час, калі шмат гадоў таму ўтваралася студыя дакументальнага кіно, Ефрасіння Леанідаўна займала важную пасаду ў міністэрстве культуры і прапанавала мне працу ў новай студыі. Не ведаю, што яна ва мне заўважыла — здаецца, быў звычайным студэнтам. Але ўсім яна характарызавала мяне як чалавека перспектыўнага і, спадзяюся, не памылілася. Так атрымалася, што Ефрасіння Леанідаўна пазней заўсёды сачыла за маім творчым лёсам.

Увогуле, спачатку я займаўся фотажурналістыкай. Нават працаваў у студэнцкія гады фотакарэспандэнтам газеты "Беларускі універстэт", дарэчы, ездзіў па гораду на універсітэцкім матацыкле ІЖ-49. Прафесія кінарэжысёра здавалася мне ў той час такой жа незнаёмай, рамантычнай, як і прафесія касманаўта. Гэта ўжо пасля я скончыў вышэйшыя рэжысёрскія курсы, дзе вучыўся ў Андрэя Таркоўскага.

Аднак журналісцкая адукацыя вельмі дапамагае мне ў працы: я і аўтар, і аператар, і сцэнарыст, і акцёр, сам займаюся кампіляцыяй музыкі. Для мяне кінематограф — гэта не толькі спосаб зарабляць грошы: мая прафесія — галоўнае ў маім жыцці. І дзякуючы Ефрасінні Леанідаўне я жыву ў гэтым, часам авантурным, але вельмі цікавым свеце.

Маленькі ўспамін на ўсё жыццё

Мы, будучыя літаратурныя супрацоўнікі раённых газет — такую нам напішуць спецыяльнасць пасля ў дыпломах — павінны былі на чацвёртым курсе аддзялення журналістыкі здаць выкладчыку прафесіянальны нарыс — для заліку.

Нарыс мы абмяркоўвалі ўсёй групай.

Усе, хто быў з вёскі, кінуліся тады пісаць пра свае калгасы: XX з'езд КПСС, Хрушчоў. Авечкін, Траяпольскі. Цендракоў — мы тады пра іх толькі і гаварылі.

А было гэта сорак гадоў назад, і вяла тады "Нарыс" у нашай групе Ефрасіння Леанідаўна Бондарава.

Я напісаў нарыс "Белыя мухі".

Пасля студэнцкага абмеркавання Ефрасіння Леанідаўна і сказала мне, каб я аднёс яго ў "Полымя". Гэта было тады вышэйшай ацэнкай. І педагога, і крытыка.

"Белыя мухі" сталі першым раздзелам маёй першай аповесці "Чачык", надрукаванай у часопісе "Полымя", калі я быў яшчэ студэнтам.

Не паступіў бы я ва універсітэт, не прыйшла б да нас у групу весці нарыс Ефрасіння Леанідаўна, не падштурхнула б яна мяне ў "Полымя" з "Белымі мухамі"...

Такое запамінаецца да назаўсёды.

Ад душы хачу павіншаваць Ефрасінню Леанідаўну з яе юбілеем і пажадаць ёй усяго самага найлепшага і каб яна і надалей штурхала са студэнцкіх аўдыторый сваіх выхаванцаў у паэзію, прозу, кінакрытыку, кінадраматургію, — у свет і ў людзі...

Іван ПТАШНІКАЎ,
пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Якуба Коласа, заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь

Прыхільнік гумару і малочных кактэйляў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар)

— Ці часта журы абвінавачваюць у неаб'ектыўнасці?

— Заўсёды. Таму што гэта трэцяя асоба ў гульні. Той, хто прайграе, ніколі не будзе задаволены рашэннямі суддзі. Увогуле, судзейства гумару — рэч даволі суб'ектыўная. Мне гэты жарт спадабаўся, а той, хто сядзіць побач, лічыць, што магло б быць і лепей.

— А Вы можаце цэнзарскім алоўкам выкрэсліваць жарты?

— Я гэтым і займаюся. Калі я лічу жарт пашлаватым ці дурнаватым, то мы яго падчас мантажу абавязкова выкінем, калі не ўдасца запэўніць каманду ў тым, што не след увогуле так жартаваць. Калі хто-небудзь іншы будзе кіраваць праграмай, якая называецца КВЗ, у яго можа быць наконт гэтага зусім супрацьлеглае меркаванне.

— Не думаю, што без Вас гэтая перадача ўвогуле зможа існаваць...

— КВЗ — гэта не аўтарская рэч. Гульню прыдумалі канкрэтныя людзі трыццаць пяць гадоў таму. Я прыйшоў у яе трыццаць тры гады таму. Два гады яна добра без мяне існавала. Цяпер я аўтарытэт для ўдзельнікаў і тэлевізійных калег. Але ж весці яе можа і хто-небудзь іншы.

— З Вашых любімчыкаў?

— Я не ўтойваю, што маю любімчыкаў сярод асобных удзельнікаў і нават цэлых камандаў. І калі хто-небудзь пацікавіцца маім меркаваннем, абавязкова дам рэкамендацыю. Але самыя таленавітыя нарасхват і без майго ўдзелу. КВЗ — выдатная рэкамендацыя пры паступленні на творчую работу.

— Ці часта на вашу тэлевізійную гульню падаюць у суд?

— Ніякія палітычныя дзеячы, ніякія артысты ніколі не звярталіся да праваахоўчых органаў з просьбай абараніць іх ад нас. Наадварот, неяк сустракаю Філіпа Кіркорава — ён пытаецца: "Куды несці грошы за тую рэкламу, якую вы на ўсёй прасторы СНД мне робіце?" Артыстам, калі ў іх ёсць пачуццё гумару, няма на што скардзіцца. Нашы ігракі звяртаюць увагу толькі на тое, што яе вартае. Хоць сустракаюцца і Лены Зосімавы, якія прыгадваюцца з іншым знакам.

— Вы і ў жыцці такі ж жартаўнік, як на сцэне?

— Дзякуй богу, не. Таму навакольным, з аднаго боку, лягчэй, а з другога — складаней са мной мець справу. Я магу, канешне, на сцэне пажартаваць, асабліва калі відаць ужо, што ніхто, акрамя мяне, не збіраецца гэтага рабіць. Гульня ж усё-такі трымаецца на жарце. Даводзіцца і мне на амбразуру кідацца. Але гэта толькі ў межах таго дзейства, што адбываецца на сцэне.

— Ваша жонка — рэжысёр праграмы, сын не прапускае ніводнай гульні, ці не занадта гумару ў Вашым асабістым жыцці?

— Жонку я сам доўга ўгаворваў прысці працаваць да мяне. Гэта адбылося пяць гадоў таму і выглядала не так жудасна, як мне спярша здавалася. Сын з шасці гадоў зусім добраахвотна сядзіць на гульнях. Я задаволены. Зараз ён вучыцца ў МГИМО і да яго ўжо ходзяць параіцца наконт удзелу ў КВЗ.

— Дык ён стварае ўласную каманду?

— Не ведаю. Гэта яго справа. Але калі такое адбудзецца, гэтай камандзе будзе вельмі складана са мной.

Доктару фізіка-матэматычных навук, прафесару кафедры тэарэтычнай механікі і робататэхнікі механіка-матэматычнага факультэта Міхаілу Дзмітрыевічу Мартыненку 22 лістапада спаўняецца 60 гадоў.

З 1971 года Міхаіл Дзмітрыевіч працуе ў Белдзяржуніверсітэце, дзе абараніў доктарскую дысертацыю і ў 1976 атрымаў званне прафесара.

М.Д.Мартыненка — буйны спецыяліст у галіне дыферэнцыйных і інтэгральных ураўненняў, механікі суцэльных асяроддзяў. Ён распрацаваў тэорыю мнагазначных патэнцыялаў і гранічных задачаў у галінах са шчылінамі, значна пасунуў тэорыю бязмомантных геаметрычных формаў тонкіх пругкіх абалонак. Значныя вынікі атрымаў Міхаіл Дзмітрыевіч у тэорыі пругкасці кантактных целаў, тэорыі салітонаў, гідрамеханіцы і геамеханіцы. Ён апублікаваў больш за 300 працаў. Прафесарам Мартыненкам падрыхтаваныя 21 кандыдат і 2 дактары навук.

Міхаіл Дзмітрыевіч — чалавек шырокага кола інтарэсаў, надзвычай рознабаковы і эрудыраваны.

Зычым яму моцнага здароўя, далейшых творчых поспехаў і сямейнага дабрабыту

Ад імя вучняў М.А.ЖУРАЎКОЎ,
доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар

Універсальныя сістэмы камп'ютэрнай матэматыкі

Працягваючы тэму выкарыстання сучасных сістэмаў камп'ютэрнай матэматыкі ў сярэдніх і вышэйшых навучальных установах (у прыватнасці, у БДУ), закранутую ў папярэдніх выпусках "Беларускага універсітэта", гэтай публікацыяй мы пачынаем серыю кароткіх аглядаў універсальных матэматычных пакетаў, якія існуюць сёння на рынку праграмнага забеспячэння.

Як правіла, усе гэтыя пакеты добра дакументаваныя і маюць версіі для большасці распаўсюджаных платформаў і аперацыйных сістэмаў. Апошнім часам фірмы-вытворцы надаюць вялікую ўвагу распрацоўцы праграмаў, спецыяльна прызначаных для навучання. Таму праграмныя прадукты, якія распрацоўваліся дзесятак гадоў таму для падтрымкі навуковых і інжынерных даследаванняў, сёння становяцца інструментамі навучальнай дзейнасці і пачынаюць уплываць на працэс навучання.

Maple V: што гэта такое?

Матэматычная праграма Maple з'яўляецца распрацоўкай канадскай фірмы Waterloo Maple і вядомая беларускаму карыстальніку ўжо больш за 10 гадоў. У апісанні пакет Maple V называецца Symbolic Computation System or Computer Algebra System (Сістэма сімвальных вылічэнняў, або Сістэма камп'ютэрнай алгебры), што можна лічыць сціслым, але даволі дакладным адлюстраваннем усёй ягонай ідэалогіі: Maple "імкнецца" аперaваць сімваламі паўсюль, дзе гэта магчыма, і пераходзіць на работу з лічбамі толькі ў выпадках тэарэтычнай невыканальнасці аналітычнага рашэння той ці іншай праблемы або па спецыяльнай каманде карыстальніка.

Да перавагаў пакета можна далучыць велізарныя бібліятэкі і ўбудаваныя пакеты (вытокі Maple бяруць пачатак у багатых матэматычных напрацоўках Фартрана), вельмі зручную і натуральную структуру даведачнага матэрыялу, лаканічны інтэрфэйс, магчывасць пераводзіць змест рабочага дакумента ў LaTex, што дапамагае спрасціць падрыхтоўку публікацыяў для навуковых работнікаў.

Інтэрфэйс Maple арыентуецца на карыстальнікаў, для якіх не падаецца цяжкім увесці складанае матэматычнае выражэнне ў тэкставым рэжыме (як у асяродках традыцыйных моваў праграмавання). Структура дакумента Maple можа канфігуравацца па жаданню карыстальніка: выкарыстоўва ад назваў параграфаў, можна раскручваць і скручваць асобныя часткі тэкста, што вельмі зручна пры рабоце з вялікімі дакументамі.

Maple змяшчае ў сабе напісанае на мове Сі ядро, якое падтрымлівае большасць асноўных функцыяў, з якога можна выклікаць вялікую колькасць бібліятэкаў, рэалізаваных на ўнутранай мове Maple (у версіі Maple V Release 4 налічваецца 31 бібліятэка). Такая ўнушальная распрацоўка патрабуе пэўнай абароны (Maple V Release 4 працуе толькі з электронным ключом) і займае (толькі бібліятэкі) да 24 Мб дыскавай прасторы.

Axum 5.0

Пакет Axum 5.0 — распрацоўка фірмы MathSoft. Ён уяўляе з сябе менш універсальны сродак, чым, скажам, Maple, і арыентуецца на пабудову графікаў розных тыпаў, правядзенне статыстычных апрацовак і аналіз данных.

Axum без праблемы можа выкарыстоўваць данные Exele, Mathcad і гэтак жа проста дазваляе размяшчаць згенерыраваныя выявы і графікі практычна ва ўсялякім Windows-дадатку. Пакет прадастаўляе разнастайныя інструменты для фарматавання і афармлення графікаў, дазваляе хутка пабудаваць графік па падрыхтаваных шаблонах. Графічныя файлы можна захоўваць у розных фарматах.

Для работы з даннымі ёсць шырокі набор функцыяў апрацоўкі электронных табліцаў, бібліятэка статыстычных працэдураў, вялікі набор ўбудаваных матэматычных функцыяў.

Уласная камандная мова Axum дазваляе аўтаматызаваць паўтаральныя аперацыі шляхам стварэння карыстальніцкіх функцыяў. Пакет дазваляе падключаць і выкарыстоўваць знешнія функцыі, ў тым ліку і DOS-праграмы.

Для работы з Axum патрабуецца 486-сумяшчальны камп'ютэр з 16 Мб аператыўнай памяці, 14-20 Мб на цвёрдым дыску, Windows 95, NT або 3.1x, Windows-сумяшчальная відэакарта, 3,5" дыскавод.

С. ЗЯМСКОЎ, Цэнтр інфармацыйных тэхналогіяў БДУ

Над Мінскам павіс крывавы кашмар...

Гэтымі словамі Янкі Купалы нездарма пачынаецца артыкул. Споўнілася 60 гадоў з часу трагічнай гібелі ў канцы кастрычніка 1937 года рэктараў, навукоўцаў, студэнтаў БДУ.

Пра першых рэктараў універсітэта мы сёння ведаем нямнога. Калі спытаць на універсітэцкіх калідорах аб іх, магчыма, назавуць Уладзіміра Пічэту. А іншыя? Наўрад ці... Але памяць пра гэтых людзей на сённяшні дзень захоўваюць архівы. Імёны іх — у журботным спісе ахвяраў сталінскага генацыду. Наш маральны абавязак — вярнуць гэтыя імёны сучаснікам, захаваць памяць.

У 1929 годзе ў сувязі з разгортваннем барацьбы супраць "нацыянал-дэмакратызму" і абвінавачаннем у прыналежнасці да міфічнага "Саюза вызвалення Беларусі" быў адхілены ад пасады рэктара БДУ Уладзімір Пічэта. Рэктарам быў абраны (а потым і зацверджаны Наркаматам асветы БССР) Язэп Каранеўскі, які ўжо шмат гадоў працаваў у сістэме адукацыі на Беларусі.

У 1914 годзе ён скончыў Мінскі настаўніцкі інстытут. У маі 1917 года Язэп Пятровіч разам з У.М.Ігнатоўскім, А.Сташэўскім, М.С.Кудзелькам (Міхасём Чаротам), С.Г.Булатам прыняў актыўны ўдзел у стварэнні арганізацыі "Маладая Беларусь", якая аб'ядноўвала пераважна навучэнцаў і сельскую інтэлегенцыю і па сваёй палітычнай праграме стаяла блізка да Беларускай сацыялістычнай рамады. Язэп Каранеўскі быў не толькі арганізатарам, але і актыўным сябрам гэтай арганізацыі.

У 1919 годзе "Маладая Беларусь" увайшла ў склад Беларускай партыі эсэраў. Пра дзейнасць Язэпа Каранеўскага ў гэты час нам пакуль нічога не вядома. Верагодна, ён далучыўся да левай плыні БПС-Р, якая актыўна ўключылася ва ўзброенае супраціўленне польскаму акупацыйнаму рэжыму.

1 студзеня 1920 года ініцыятыўная група сяброў "Маладой Беларусі", у якую ўвайшоў і Язэп Каранеўскі, стварыла арганізацыйны цэнтр Беларускай камуністычнай арганізацыі. Новае ўтварэнне падтрымлівала мэты бальшавіцкай рэвалюцыі і ў той самы час імкнулася праводзіць палітыку ў інтарэсах беларускага народа. Язэп Каранеўскі ўвайшоў у Цэнтральны камітэт БКА, якая вяла барацьбу ў падполлі і арганізоўвала партызанскі рух супраць польскіх вайсковых гарнізонаў.

Пасля вызвалення Мінска ад палякаў у ліпені 1920 года і абвяшчэння 31 ліпеня Дэкларацыі незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь сябры БКА актыўна ўключыліся ў працу па адраджэнню нацыянальнай дзяржаўнасці беларускага народа. Пасля роспуску БКА Язэп Каранеўскі пераходзіць на працу ў толькі што створаны Наркамат асветы ССРБ, які ўзначаліў яго старэйшы таварыш Усевалад Ігнатоўскі. На час працы Язэпа Пятровіча ў Наркамаце асветы прыпадае стварэнне Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Інстытута беларускай культуры (будучай Беларускай Акадэміі навук). Менавіта ў гэты час закладаюцца асновы беларусізацыі — палітыкі нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва Беларусі. Гэтаму нямала паспрыяў Язэп Каранеўскі, які пасля Наркамата асветы працаваў у Інстытуце беларускай культуры, потым — прарэктарам Камвуза Беларусі і, нарэшце, рэктарам Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Аб яго дзейнасці на гэтай пасадзе вядома няшмат. Універсітэт ён прыняў у складаны момант, калі частка навукоўцаў БДУ была арыштаваная па "справе СВБ". Дый часу новаму рэктару было адпушчана мала. Ужо 26 ліпеня 1931 года Язэп Каранеўскі быў вызвалены з пасады рэктара. Можна толькі здагадвацца, што стала сапраўднай прычынай. Верагодна, працяг рэпрэсіяў у асяроддзі нацыянальнай інтэлегенцыі...

Язэп Пятровіч быў накіраваны на працу ў Інстытут чырвонай прафесуры сусветнай гаспадаркі і сусветнай палітыкі. У 1937 годзе ён стаў памочнікам дырэктара гэтага інстытута.

Органы НКУС СССР арыштавалі яго 15 ліпеня 1937 года. Праз тры месяцы (28 кастрычніка) Ваенная калегіяй Вярхоўнага суда СССР ён быў прыгавораны да вышэйшай меры пакарання як член прыдуманай следчымі "нацыянал-фашысцкай арганізацыі".

Па іншых звестках, Язэпа Каранеўскага адправілі пасля прысуду ў канцэнтрацыйны лагер, а ў канцы 1937 года прывезлі ў асобны каменданцкі лагер "сталіцы" Байкала-Амурскіх лагераў — горад Свабодны (!). На трэці дзень яго ў партыі вязняў з Мінска пагналі са Свабоднага на "закрытую" калону № 66. Далейшы лёс яго невядомы.

Але больш верагодна (што пацвярджаецца дакументамі), Язэпа Пятровіча Каранеўскага расстралялі 29 кастрычніка 1937 года. Магчыма ў Курапатах... Разам з ім у гэты дзень былі расстраляныя і іншыя выкладчыкі і студэнты універсітэта: рэктар БДУ, наркам асветы А.І.Дзякаў, прарэктар БДУ А.С.Кучынскі, дэкан фізмата БДУ Я.К.Успенскі, студэнт рабфака БДУ В.Ю.Сеўрук, выпускнік педфака БДУ А.А.Дайлідовіч (Алесь Дудар) і шматлікія іншыя.

Толькі 6 красавіка 1957 года справа Я.П.Каранеўскага была перагледжаная Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР, прысуд быў адменены і справа спыненая з-за адсутнасці складу злачынства.

А.Г.ЗЕЛЬСКІ, загадчык музея гісторыі БДУ

Усе на лекцыі!

Прайшоў Дзень студэнта, і напярэдзе ізноў лекцыі, семінары, залікі... Студэнты, якія правучыліся хаця б некалькі месяцаў, прызнаюцца, што ўжо стаміліся ад штодзённай руціны: дом — падрыхтоўка да семінараў — універсітэт. А так хочацца разнастайнасці: пабыць з сябрамі, замест лекцыяў пагуляць па гораду ці проста пабыць дома.

Седзячы дома перад тэлевізарам ці лежачы ў ложку з філіжанкай кавы, мы нават не задумваемся, што, прапускаючы заняткі, самі сабе ствараем праблемы і лішнія хваляванні на будучую сесію. Пустыя канспекты, выкладчык, упершыню пабачаны на іспыце...

Усяго гэтага можна пазбегнуць — варта толькі прыходзіць на лекцыі. Гэта ж так добра, калі мы ўсе разам збіраемся ў аўдыторыі. І адпачынак пасля напружанага тыдня будзе здавацца больш прыемным.

Юлія ШЧАРБАКОВА, студэнтка факультэта журналістыкі

Лепей засцерагчыся, чым захварэць

Дыфтэрыя застаецца адным з сур'ёзных інфекцыйных захворванняў, здольных шырока распаўсюджвацца сярод насельніцтва, якое не мае імунітэту. Гэтаму спрыяе высокая ступень выжывальнасці дыфтэрыйных палачак: у пыле і на прадметах навакольнага асяроддзя яны могуць захоўвацца да 2-3 тыдняў. Але часцей захворванне перадаецца паветрана-кропельным шляхам. Заражаюцца тыя, хто большасць часу праводзіць у закрытых памяшканнях з вялікай колькасцю людзей.

Класічна дыфтэрыя праходзіць даволі цяжка. Узбуджальнік захворвання выклікае паражэнні ўнутраных органаў і сістэмаў арганізма, выдзяляючы ў кроў таксін — бактэрыяльны яд. Найбольш цяжкое ўскладненне — ацёк гартані, а таксама небяспека паражэння сардэчнай мышцы, што выклікае гібель хворага ад дыфтэрыйнага міякардыту.

Медыцына ў барацьбе з гэтай інфекцыяй пайшла шляхам стварэння штучнай неўспрымальнасці да дыфтэрыі праз правядзенне прафілактычных прышчэпак. Высокі ўзровень імунітэту захоўваецца пасля прышчэпкі на працягу 5 гадоў. Варта адзначыць, што перанесенае захворванне дыфтэрыяй не пакідае доўгага імунітэту, таму прышчэпкі робяць і пасля выпіскі з клінікі. Узроставых абмежаванняў пры гэтым няма. Прышчэпкі супраць паказаныя толькі асобам, у якіх былі сур'ёзныя рэакцыі і ўскладненні на аналагічныя ранейшыя прышчэпкі.

Барацьба з дыфтэрыяй — справа агульнадзяржаўнай важнасці. Непрышчэплены чалавек можа занесці інфекцыю ў калектыў і стаць вінаўным ў захворванні ці нават смерці іншага чалавека. Надзейна абароненым можа лічыцца толькі калектыў, дзе прышчэпленыя складаюць 90-95 % ад агульнай колькасці.

Апрача прышчэпак, іншага шляху барацьбы з дыфтэрыяй няма!

А.ТАРАСАВА, галоўны санітарны ўрач Ленінскага раёна Мінска

ГОДНАСЦЬ — манета неразменная

Андрэй Робертавіч Шкураў — намеснік начальніка ваеннай кафедры Белдзяржуніверсітэта, палкоўнік, афіцэр-артылерыст, удзельнік баявых дзеянняў у Дэмакратычнай Рэспубліцы Афганістан. У 25 гадоў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, знакам "За мужнасць і воінскую доблесць".

У 1986 годзе палкоўнік Андрэй Шкураў быў яшчэ маёрам.

— Андрэй Робертавіч, што Вы ўключаеце ў паняцце годнасці?

— Нядаўна я з вялікім задавальненнем перачытаў "Аэрапорт" Артура Хейлі. Запомніліся словы: "Праз гады змяняешся ты, змяняецца тваё светаўспрыманне". Змяняецца, канешне, і разуменне годнасці як унутранай маральнай якасці. Але галоўнае — на чым яна грунтуецца. Для мяне, баявога афіцэра, годнасць — гэта другое "сэрца". Б'ецца яно — значыць, чалавек жыве духоўна і шчыра. Як бы ні было цяжка, годнасць, на маю думку, усё ж такі не разменная манета. Як камандзір мінамётнай батарэі я мусіў не толькі выканаць баявую задачу, але і захаваць жыццё людзям. Толькі тады я меў маральнае права казаць: "Годнасць маю".

— Бываючы ў камандзіроўках у "гарачых кропках", я спрабаваў у размовах з салдатамі, сержантамі і афіцэрамі гаварыць аб годнасці, гонары. А дыялог не атрымліваўся — яны проста пасміхаліся. Напэўна, тут нешта не так?

— Там, дзе, умоўна кажучы, праходзіць мяжа паміж жыццём і смерцю, размовы аб годнасці і гонары заканчваюцца пасля першага рэальнага бою. Баявая абстаноўка — гэта нібы мартэн, дзе людская сталь вызваляецца ад шлакаў, якія засмечваюць гэтыя паняцці.

— Сёння адбываецца падзенне маральнасці моладзі. Да паняцця годнасці — далёка. Што Вы думаеце на гэты конт?

— Абсалютна пагадзіцца з такой пастаноўкай пытання не магу. Я пастаянна праводжу заняткі па спецыяльнай падрыхтоўцы са студэнтамі і прыходжу да высновы, што маладыя людзі пакуль што не разгубілі сваю маральнасць і духоўнасць. Ім проста патрэбна своечасова дапамагаць. Мяне цешыць, што кіраўніцтва БДУ праяўляе няспынны клопат пра студэнцкую моладзь. Дакладна функцыянуе і дае прагрэсіўныя зрухі сістэма выхаваўчай работы, якая склалася ў новых умовах. Свой уклад у гэтую справу робіць і прафесарска-выкладчыцкі састаў ваеннай кафедры. Выхаваўчая праца — гэта таксама бой, толькі ў адрозненне ад рэальнага ў ім не гінуць, а нараджаюцца сапраўдныя людзі.

Размаўляў
Анатоль КОНАНАЎ,
дацэнт

І зноў юрысты

Закончыўся універсітэцкі турнір па футболу. Карэспандэнт "БУ" Вольга КАЗДЗЕРКА распавядае больш падрабязна пра ход апошніх гульняў і падводзіць вынікі.

Трэнер юрыстаў Віталь Цімафеевіч больш не хвалюецца.

Барацьбу за 1-4 месцы распачалі журналісты і радыёфізікі. Трэба адзначыць, што гульня апошніх глядзелася лепей: кожны выконваў менавіта сваю працу. Здавалася, што радыёфізікі не будуць цацкацца з сапернікамі, але гэта быў "не іх дзень". Памылка вратара — і невядома адкуль у штрафной саперніка ўзяўся Лёша Міхаленя, пасля чаго журналісты павялі ў ліку 1:0. Пенальці бездакорна выканаў лепшы бамбардзір журфака Міхась Бандарэнка (2:0). Журналісты атрымалі першыя тры ачкі, але гэта была пірава перамога. Акрываўлены пакінуў поле Міхась Бандарэнка, які крыху пазней вярнуўся ў гульню. А ў капітана Кастуся Ногціча "заявіла" аб сабе старая траўма, і дактары забаранілі яму ў бліжэйшы месяц нават дакранацца да мяча.

У юрыстаў з прадстаўнікамі ФПМ праблемаў амаль не было. Матэматыкі супраціўляліся як маглі. На мяч юрыста Дзяніса Карбачова адказаў гол-лам матэматык Кастусь Прымакоў. Але гульня ўсё ж закончылася з лікам 4:2. Юрысты пасля першага тура занялі месца пераможцаў.

На другі дзень спаборніцтваў у трэнера юрыстаў Віталя Цімафеевіча ўзнікла пытанне: як гуляць супраць журналістаў? Журфак не меў ніводнага паражэння на турніры, у дзвюх апошніх гульнях разграміў геафак і добра "прайшоўся" па радыёфізіках, хаця раней ніколі не славіўся ні гульнёй, ні вынікамі. Але Віталь турбаваўся дарма: журфак выйшаў на гульню знямоглы. Не было траўмаванага капітана і апошняга абаронцы Кастуся Ногціча, развалілася абарона, а варатар у журналістаў далёка не лепшы. Пісаць пра гульню няма ніякага сэнсу, бо гуляў толькі юрфак. Пасля чатырох мячоў журналісты кінулі нават спробы неяк утрымаць сапернікаў. Агульны лік — 7:0.

Ад гульні ФПМ і радыёфізікаў шмат залежала. Радыёфізікі ачомаліся пасля паражэння ад журналістаў, а ФПМ зноў чагосьці не хапіла. Матч скончыўся з лікам 3:1 на карысць радыёфізікаў.

Журфак меў шанц утрымацца на другім месцы: яму была патрэбная нічыя ў матчы з ФПМ. Але... На штангах і перакладзіне журфакаўскіх варотаў не засталося месца, куды б не пацэліў мяч пасля ўдару ФПМ. Доўга журналістам шанцаваць не магло: адзін удар трапіў-такі ў вароты. Толькі на апошніх хвілінах Міхасю Бандарэнку ўдалося адыграцца з адзінаццаціметровага.

Юрфак перад сваёй апошняй гульнёй крыху хваляваўся: паражэнне каштавала б яму першага месца. Але забіўшы два мячы, хлопцы паверылі ў сваё чэмпіёнства і збавілі абароты. Агульны лік — 3:1.

Турнірнае становішча
1. Юрфак
2. Журфак
3. Радыёфізікі
4. ФПМІ
5. Геафак
6. Фізфак
7. Гістфак
8. Біяфак
9. ФМА
10. ММФ
11. Філфак
12. ФЭФ
13. Хімфак

Лепшы бамбардзір турніру — Дзяніс Карбачоў з юрфака (8 мячоў).

Чатыры дні зборнай,
або Ці стане БДУ чэмпіёнам Беларусі па футболу?

Дзень першы
Штосьці будзе

Магутная постаць Віталя Собаля, капітана зборнай БДУ і філфака, прыцягвала позіркі — на стадыёне праводзіла першую сёлета трэніроўку зборная БДУ. Яна ж была і апошняй перад чэмпіянатам Рэспублікі Беларусь па футболу сярод студэнтаў. Галоўны трэнер Анатоль Данілавіч Дзідзюля імкнуўся зрабіць яе як мага больш прадуктыўнай і даў вялікія нагрузкі. Але без падрыхтоўчага перыяду хлопцы моцна стаміліся. Да таго ж у камандзе багата навічкоў, якія не толькі ніколі не гулялі разам, але і ўпершыню пабачылі адзін аднаго. Не было ў камандзе і мацнейшых іракоў факультэтаў — футбалістаў другой і трэцяй ліг нацыянальнага чэмпіяната.

З трэніроўкі хлопцы разыходзіліся змучаныя і разлаваныя: каманда разладжаная, настрою няма, нават перазнаёміцца як след не паспелі. А заўтра — гульня супраць педуніверсітэта. Хіба што за вечар паспрабаваць сабраць наймацнейшых іракоў з розных факультэтаў...

Дзень другі
Страты

...Нікога з "наймацнейшых" знайсці не ўдалося. Нядобрай была вестка з геафака: захварэў Віця Таўкач, першы варатар зборнай. На першых хвілінах гульні атрымаў балючы ўдар па назе левы паўабаронца Андрэй Аўдзееў і хадзіць ужо амаль не мог...

Педуніверсітэт гуляў больш прафесійна. Здавалася, ад каманды БДУ восьвось застануцца толькі рэшткі. Але праліўны дождж ператвараў газон у непраходны бруд, і не вельмі высокая тэхніка футбалістаў педуніверсітэта не дазваляла гуляць так, як хацелася б. У выніку — лік 0:0.

Дзень трэці
Ода лужынам

Лінгвістычны універсітэт, які згуляў унічыю з політэхнічнай акадэміяй, спрабаваў адыграцца на БДУ. Толькі лужыны, што запоўнілі амаль усю варатарскую пляцоўку, разоў пяць выратоўвалі нашу каманду. Ды яшчэ двойчы саперніі не разлічылі габарыты варатара — Мішы Лукашэвіча. Бліжэй да перамогі быў усё ж наш універсітэт, але Віталь Собаль не забіў пенальці...

Дзень чацвёрты
Можа, пранясе...

На гэты раз нашай зборнай не пашчасціла. БДПА, атрымаўшы гучную поўху ад педуніверсітэта (1:0 на карысць "педагогаў" пры поўнай перавазе політэха), выйшла на гульню нібы на апошні бой. А вось каманда БДУ пра гэта, відаць, не падумала і — прапусціла столькі, колькі пажадалі політэхнікі (0:5). Сказаліся і высокі клас гульні БДПА, і стомленасць нашых хлопцаў, і адсутнасць гульнёвых сувязяў у БДУ, і не вельмі якаснае суддзейства.

Вынік удзелу зборнай БДУ ў чэмпіянаце — апошняе месца ў групе, пяць прапушчаных мячоў і ніводнага забітага, разгромнае паражэнне і дзве шчасных нічыіх, поўная адсутнасць камандных гульні... Не буду працягваць. Выснова напрошваецца сама... А калі паглядзець не на гульню каманды, а на іракоў паасобку? Міша Лукашэвіч (варатар геафака) згуляў лепш, чым ад яго чакалі. Аднак лепшая каманда БДУ мусіць мець больш моцнага другога варатара: абарона ўвесь час гуляла, азіраючыся назад. Міша Лукашэвіч (капітан мехмата) нядрэнна трымаў абарону. Але некалькі разоў не трапіў па мячу, пасля чаго ўзніклі непрыемныя моманты каля нашых варотаў. Эдуард Апанасюк быў адным з лепшых. Амаль беспамылкова гуляў на сваім месцы цэнтральнага абаронцы, а з пераводам на фланг паўабароны "знік". Нападаючы Аляксандр Корсак больш карысці прынёс бы каля чужых варотаў. Гэта для яго больш звыкла, чым змагацца з атакамі саперніка. Але нават не на сваёй пазіцыі левага абаронцы ён вялікіх нараканняў не выклікаў. Ягор Канончык працаваў "за сябе і за таго хлопца". Віталь Собаль, займаючы месца апорнага, больш гуляў на абарону, чым на атаку. Каму трэба паставіць помнік, дык гэта Андрэю Аўдзееву. Атрымаўшы даволі балючую траўму, ён працягваў гуляць. І праблем на яго левым фланзе зборная не мела. Шалва Гегелія шмат бурчаў не па справе і гуляў без настрою... У Дзмітрыя Русальскага тэхнічны брак амаль адсутнічаў, але гэта не флангавы ігрок: яго ўвесь час вабіла ў цэнтр, дзе ён з задавальненнем дапамагаў зусім юнаму Дзянісу Карбачову. Дзяніс Карбачоў — адзіны першакурснік, які ўвашоў у аснову зборнай. Відаць, што хлопец тэхнічны, мае магутны ўдар, удала выбірае пазіцыю. Але партнёры не часта гулялі на яго, дый сам ён не вельмі раззнаёміўся. Пашу Лутовіча знайшлі толькі на трэцюю гульню. З ягоным з'яўленнем на полі стала прабівацца нешта падобнае да малюнка гульні. Дзмітрый Лаўроў можа ўдала зачапіцца за мяч, патрымаць яго, але фізічнай падрыхтоўкі яму заўсёды не ставала. Максім Лорчанка — вось каго трэба было выпускаць у аснове. Уся вастрыня атакі ішла ад яго. Абаронцы маглі спыніць шустрага нападаючага толькі праз парушэнне правілаў... Праўда, трэнер чамусьці вырашыў прытрымаць Максіма ў запасе. Мікола Стуло — яшчэ адзін нападаючы, які шмат чаго мог зрабіць для каманды, але яму ўвесь час не давалі спакою траўмы.

Патэнцыял у каманды ёсць, але не стае сумесных гульняў. "Педагогі" ўсю зіму гуляюць у чэмпіянаце па міні-футболу, каманда тэхналагічнага збіраецца па 3-4 разы ў тыдзень. А зборная БДУ толькі пачала збірацца.

Вольга КАЗДЗЕРКА

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Заснавальнік газеты - БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета надрукавана на Мінскай паліграфічнай фабрыцы "Чырвоная зорка" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3. Ум. друк. арк. 1 Падпісана ў друк у 12.00.

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

20 ЛІСТАПАДА Зак. 1799 Т. 1000 экз.

Бясплатна

Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412, тэлефон 2206827.

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ